Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі
Серыя «Мінскія маладыя галасы»

ТАЦЦЯНА МАЦЮХІНА

# Адчуць гармонію душы

Вершы

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2015

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
М35

*Серыя заснавана ў 2011 годзе*

**Рэдакцыйны савет:**
*Міхась Пазнякоў, Ліліяна Анцух, Алесь Бадак, Міхась Башлакоў, Наталія Касцючэнка, Мікола Шабовіч, Віктар Шніп*

**Галоўны рэдактар серыі**
*М. Пазнякоў*

**Прадмова**
*М. Тычыны*

**Мацюхіна, Т. Б.**
М35 Адчуць гармонію душы : вершы / Таццяна Мацюхіна. — Мінск : выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2015. — 64 с. (Сер. «Мінскія маладыя галасы»).

ISBN 978-985-7103-39-3.

У аснове кнігі — тэма пошуку сваёй жыццёвай дарогі, асэнсаванне духоўных каштоўнасцей праз прызму свайго «Я». Лірычная гераіня аўтара знаходзіць сябе ў сардэчнай малітве да Боскага цуду і глыбокім адчуванні музыкі, у захапленні хараством прыроды і любові да Радзімы.

Тут цесна пераплеценыя сон і рэальнасць, міф і сапраўдная гісторыя з жыцця аўтара. Тэма кахання і самавыражэння ў мастацтве — вядучая ў кнізе.

**К 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7103-39-3**

© Мацюхіна Т. Б., 2015
© Тычына М. А., прадмова, 2015
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2015

# Лёгкія крокі верша

Ёсць паэты, пра якіх кажуць: «паэт аднаго верша». Ён можа за сваё жыццё напісаць і нават надрукаваць 10 тамоў вершаў, але народнае веча, ведаючы, што многія з іх вартыя ўвагі, усё роўна будзе згадваць назву толькі аднаго з іх.

Прачытаўшы верш Таццяны Мацюхінай «Словы бы пацеркі...», які адкрывае першую яе кніжку, адчуваеш, што гэта толькі крыніца гуку і што яна служыць узорам для настройкі музычнага інструмента. Кранае «мяккасць пяшчоты» ў гучанні слова і паэтычнага радка, якія ляжаць ля «вытоку». Адалей — «гукі сплятаюцца ў фразы ў адзінстве пошукаў сэнсу, магчымасцяў, выйсця...», і ты ўжо захоплены «плынню свядомасці», дзе хваля, як крыгалом увесну, падхоплівае і імчыць твае пачуцці і тваю думку: «Жорсткасць міне, але след застанецца». Пра што ўсё гэта — «пошукі сэнсу», «магчымасцяў, выйсця», «жорсткасць», пасля якіх у душы застаецца глыбокі «след»?

Наўрад ці могуць служыць адказам на пытанні чытача, на яго невытлумачальную ўнутраную збянтэжанасць, хутчэй усяго толькі кволым намёкам, радкі пра «вочы маленства» і пра тыя вочы, «якія забылі». Але не забыла «бярозка», у маўклівай прысутнасці якой усё адбывалася, захавала ў сабе яе памяць, нагадаўшы, як рэха, пра нядаўнія падзеі, вачам, якія «любілі...». Ці сапраўды любілі? Усё — ад будовы радка, лаканічнага слоўніка, адсутнасці рыфмоўкі і да шматкроп'я ў канцы — сведчыць аб пачатку размовы з чытачом.

Тут ужо недастаткова быць «паэтам аднаго верша», нават калі ў ім, як у мікракосме, засяроджаны ўсе таямніцы паэтычнага хараства, усе загадкі мастацкай творчасці. Перад намі ўжо не «маладая паэтэса», а дастаткова вопытны і сталы аўтар, у творчым заплечніку якога ёсць вершы, не выкарыстаныя ў гэтым зборніку, што, відаць, чакаюць свайго часу для наступнай кнігі, апавяданні, аднаактоўкі, абароненая кандыдацкая дысертацыя, прысвечаная беларускай паэзіі імпрэсіянізму. Перад намі ўжо рэальны макракосмас паэтычнай творчасці. Змест кнігі запаўняюць не вершы пра першае каханне, якое, паводле слоў Генрыха Гейнэ, падобна «страшнаму землятрусу душы», а пачуццю больш глыбокаму і, як можа чытач адчуць далей, сапраўды драматычнаму: «Адлічу гадочак, што мяне збярог, ад дарог — нявартых і сяброў — чужых, ад прыязні — ў здрадзе і людзей ліхіх». У выніку горкіх пакутаў і разваг лірычная гераіня, расчараваная ў каханні чарговага шукальніка любоўных прыгодаў, спасцігла, што азначае спалучэнне «альфа і амега»: «Лёс мой табе, белая лілея, цудадзейны спеў і канца пачатак, новага віток... У лілеі квет ападзе не хутка, бо любоў як свет. Вечная...».

Таццяна Мацюхіна невыпадкова згадвае імя не толькі Генрыха Гейнэ, але і даследчыка паэзіі Рамана Інгардэна, у якога яна вучылася будаваць верш, як структуру «двух вымярэнняў», — у адносінах да жывапісу размова ідзе пра «пласт» або «кампанент» твора, а ў дачыненні да музыкі —

прынцып «шматфазнасці» і суадносін «рэальнага і ўспрыймаемага». Прынамсі, дзіцячае захапленне музыкай паэтэсы не мінула з яе ўзростам.

У «трохмернай» форме верша «Элегія ўзвышанага настрою» гэта прызнанне Р. Інгардэнам розных «вымярэнняў» у структуры верша (класы мастацтваў, у якіх займае месца час, прастора і прастора-час) асабліва наглядна падкрэслівае ролю і месца мастацтва часу, а менавіта музыкі: «Шукала словы — // Уздыхалі фразы. // І тэкст звінеў // Ласкавым матыльком. // Гармоніяй Інгардэна // Ў парадзе — // Суквецця сэнсу і // Кароткіх сноў. // Мелодыя гучала // У кантаце. // Графічнасць знакаў // Навявала сум // У адкрыцці, // Адчуванні, // Парыванні // Без сэнсу, // Без магічных слоў. // Але я рушыла // І фразы разбурала, // Ад болю музыку // Хавала у сабе. // Хацела крыкнуць Вам: // «Душа зламана рана». // Хацела б збегчы // Ў свет сваіх ідэй... // Рэфрэн гучаў. // Спявачка адчувала: // Паўтор не мае права // Быць другім. // Яна не ведала, // Што музыка гучала // Як страчаная вера — // Без надзей... // Схаваць душу // У панцыр не змагла я. // Інгардэн мне даруе, // А не Вы. // Памылка толькі ў тым, // Што давяраць я // Не буду Вам ніколі, Праметэй». Так завяршылася спрэчка тэарэтыка літаратуры пад умоўным імем «Праметэй», які глыбакадумна рэкламаваў «чыстую каштоўнасць разважання» і «пазнання рэчаіснасці», і паэтэсы-практыка, якая аддае належнае «эмацыянальнаму перажыванню», «асалодзе» і «задавальненню», выяўленым у знакамітым афарызме французскага імпрэсіяніста Поля Верлена (вось дзе спатрэбілася захопленае вывучэнне французскага і беларускага імпрэсінізму!): «De la musigue avant toute chose» (у перакладзе Максіма Багдановіча: «Музыкі перш за ўсё»).

Вучоны Раман Інгардэн сапраўды «даруе» паэтэсе Таццяне Мацюхінай. Ёсць падставы і для спадзявання на тое, што беларускі чытач не толькі «даруе», але і зразумее высакародны

парыў паэтэсы ад відавочнай і глыбока перажытай жыццёвай дысгармоніі яе моцна закаханай лірычнай гераіні да таго, каб «адчуць гармонію душы», — назва зборніка вершаў Таццяны Мацюхінай, якая толькі на лішне прыдзірлівы позірк можа здавацца праз меру пафаснай. У сучасным неўладкаваным зямным свеце, дзе на мяжы тысячагоддзяў сутыкнуліся хаас і космас, дысгармонія і гармонія, паратункам з'яўляюцца толькі гармонія нябесных сфер (месяц, сонца, планеты сонечнай сістэмы, неабсяжны зорны свет) і гармонія чалавечых душ, якая магчыма толькі ў тых з нас, зямных істотаў, хто шчыра спавядае трыадзінства «вера — надзея — любоў», у чалавечым — мужчыны і жанчыны — варыянце гэта адзінства — каханне.

*Міхась ТЫЧЫНА*

# Пераможа боская любоў...

***

Словы бы пацеркі.
Лёгкія крокі.
Мяккасць пяшчоты
кранае вытокам.
Гукі сплятаюцца
ў фразы ў адзінстве
пошукаў сэнсу,
магчымасцяў,
выйсця...
Жорсткасць міне,
але след застанецца.
Позіркам стрэнуцца
вочы маленства
з тымі вачыма,
якія забылі.
Рэхам прашэпча
бярозка:
любілі...

# Змест

*Тычына Міхась.*
*ЛЁГКІЯ КРОКІ ВЕРША* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

*ПЕРАМОЖА БОСКАЯ ЛЮБОЎ*
«Словы бы пацеркі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
«Альфа і амега...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
«Розныя лёсы, адметныя твары...» . . . . . . . . . . . . . 10
«Да шчасця сцежку ўпарта...» . . . . . . . . . . . . . . . . 11
«Вас чакае поспех у справах...» . . . . . . . . . . . . . . . 12
«Рамонкі белыя, як промні у пакоі...» . . . . . . . . . . 13
«У руках маіх меч, які трымаю моцна...» . . . . . . . 14
«Вясёлка ў нябёсах...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
«Я малюю фарбамі Неба...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
«Узяць паперу, маляваць...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
«Радасці блікі блішчаць...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Элегія ўзвышанага настрою. . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
«Выявіць пачуцці немагчыма...» . . . . . . . . . . . . . . 22
«Чаканне. Імгненне...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
«Я ў фарбах сваіх...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
«Зіма малюе свой пейзаж...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
«Не спяшайся. Хвіліну таму...» . . . . . . . . . . . . . . . 26
«Годная і ўрачыстая...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
«З добрых слоў, усмешкі чыстай...» . . . . . . . . . . . 28
«Цішыня не любіць мітусіцца...» . . . . . . . . . . . . . 29
«Я шукала незямное святло...» . . . . . . . . . . . . . . . 30

*У НЕБА БЕЛАЙ ПТУШКАЙ ПАЛЯЧУ*

«Утрапёна ўзіраешся ў неба...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .32
«Я Вас кахаю — вельмі асцярожна...» . . . . . . . . . . . . . . .33
«Вобразы свету хвалююць душу...» . . . . . . . . . . . . . . . . 34
«Вядома мне, што нас з табой чакае...» . . . . . . . . . . . . . .35
«Мне няпроста так. Без цябе...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
«Я хацела вярнуцца...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .37
«Не ведаю, якія змены нас чакаюць...» . . . . . . . . . . . . . .38
«Не ўбачу Вас больш, не пачую...» . . . . . . . . . . . . . . . . . .39
«У душы я Вас яшчэ кахаю...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .40
«Паглядзі ў мае вочы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .41
«Цябе шукаю ў фотаздымках, кадрах...» . . . . . . . . . . . . .42
«Сонечны позірк — яго я шукаю...» . . . . . . . . . . . . . . . . .43
«Ружаў пах...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .44
«Маё вітанне — тваё прызнанне...» . . . . . . . . . . . . . . . . .45
«Мне не хапае Цябе...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .46
«Асенні дзень квітнее ў красках...» . . . . . . . . . . . . . . . . .48
«Боскім словам мяне акрылі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .49
«Гэты вальс — мой адзіны шанец...» . . . . . . . . . . . . . . . .50
«Я гуляла пад дажджом...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .51
«Выратуй маё жыцце, малю...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .52
«Сонейка ў тваіх вачах...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53
«Даруй за слёзы. Не прашу...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
«Я ўсё ўчора спакваля рашыла...» . . . . . . . . . . . . . . . . . .55
«Словы песні не прыгадваю, маўчу...» . . . . . . . . . . . . . . .56
«Напішу я слова на пяску...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .57
«Даверыцца Вам, не згубіцца...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . .58
«Звяртаюся на Вы, — але ці варта?..» . . . . . . . . . . . . . . .59
«Пясочны малюнак складаю...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
«Здараецца...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .61